# РЭФЕРАТ

Справаздача 45 с., 2 табл.

СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА, ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА, СУЧАСНАЯ РУСКАЯ МОВА, РУСКАЯ МОВА ЯК ЗАМЕЖНАЯ, ПРАКТЫЧНАЯ І ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ СТЫЛІСТЫКА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОЎ, БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА, СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА, МОВАЗНАЎСТВА, ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА, ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧЫ ПРАЦЭС

Аб'ект даследаванняў – вучэбна-метадычныя падыходы пры фарміраванні асноўных камунікатыўных уменняў і навыкаў, якія забяспечваюць актывізацыю маўленчай і мысленчай дзейнасці будучых спецыялістаў-тэхнолагаў.

Мэта работы – прааналізаваць і сістэматызаваць інфармацыю па праблеме тэхналогіі навучання прафесійнай камунікатыўнай кампетэнтнасці студэнтаў тэхнічных устаноў вышэйшай адукацыі; выпрацаваць новыя алгарытмы камунікатыўнай падрыхтоўкі спецыялістаў-тэхнолагаў.

Змест работы падпарадкаваны яе мэце і заключаўся ў тым, каб:

– правесці тэарэтычны аналіз стану праблемы фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці па літаратурных крыніцах і непасрэдных назіраннях;

– тэарэтычна абгрунтаваць і распрацаваць мадэль фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці студэнтаў тэхнічнай ВНУ і тэхналогію яе рэалізацыі;

– распрацаваць метадычнае забеспячэнне рэалізацыі педагагічнай тэхналогіі фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці, якое адрозніваецца асобаснай і прафесійнай скіраванасцю;

– аптымізаваць дзейнасць студэнцкіх навуковых і творчых гурткоў, удасканаліць методыку арганізацыі самастойнага пошуку, навукова-даследчай працы студэнтаў;

– выяўляць таленавітую моладзь, развіваць творчыя і навуковыя здольнасці навучэнцаў, папулярызаваць вынікі іх дзейнасці.

Падрыхтаваны даклады, якія датычацца спецыфікі арганізацыі навучальнага і выхаваўчага працэсу пры рабоце з беларускімі і замежнымі навучэнцамі.

Апрабаваны тэмы вусных паведамленняў і рэфератаў па вучэбнай дысцыпліне "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" для ўсіх тэхнічных спецыяльнасцей БДТУ.

З мэтай апрабацыі асноўных вынікаў даследаванняў і замацавання маўленчых кампетэнцый выкладчыкамі кафедры праведзены шэраг студэнцкіх навукова-практычных канферэнцый, а таксама арганізаваны ўдзел у Міжнародных і Рэспубліканскіх навукова-практычных канфэрэнцыях студэнтаў і маладых даследчыкаў.

# УВОДЗІНЫ

У адпаведнасці з гадавым планам навукова-даследчай работы на 2023 год на кафедры выконвалася навукова-даследчая тэма БП 40-23 «Прафесійна арыентаваныя тэхналогіі навучання лінгвістычным дысцыплінам студэнтаў негуманітарных спецыяльнасцей».

Прайшлі апрабацыю наступныя тэмы вусных паведамленняў і пісьмовых рэфератаў, прадугледжаныя ў якасці абавязковага кампанента кіруемай самастойнай работы пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" (для ўсіх тэхнічных спецыяльнасцей БДТУ):

1. Мова – душа народа.
2. Герб, гімн і сцяг Беларусі – галоўныя сімвалы дзяржаўнасці.
3. Помнікі беларускага пісьменства.
4. Эпоха Адраджэння ў беларускай культуры.
5. Беларускае кнігадрукаванне.
6. Славутыя людзі зямлі беларускай (навукоўцы).
7. Мінск – сталіца Беларусі.
8. Анамастыка як крыніца вывучэння этнічнай культуры беларусаў.
9. Беларусь на карце свету.
10. Фальклор – скарбніца этнічнай культуры беларусаў.
11. Беларуская міфалогія.
12. Святы і абрады беларусаў.
13. Этнаграфія Беларусі.
14. Рэлігія на Беларусі.
15. Беларускае дойлідства.
16. Менталітэт і нацыянальны характар беларусаў.
17. Нацыянальныя супольнасці ў Беларусі.
18. Музычная культура Беларусі.
19. Беларускі тэатр.
20. Сучасная паэзія, проза, драматургія.
21. Беларускае выяўленчае мастацтва.
22. Экалогія Беларусі.
23. Гераічная Беларусь.
24. Народная педагогіка беларусаў.
25. Беларускі спорт.
26. Барбара Радзівіл – Чорная Дама Нясвіжскага замка.
27. Мікалай Радзівіл Чорны – магутны рыцар нашай незалежнасці.
28. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі перша- друкар.
29. «Катэхізіс» С. Буднага – першая беларуская кніга.
30. Мікола Гусоўскі і яго паэма «Песня пра зубра».
31. Яўхім Карскі – бацька беларускай філалогіі.
32. Славутыя жанчыны Беларусі.
33. Таямніцы Мірскага замка.
34. Старажытны Менск.
35. Замкі на зямлі Беларусі.

36. Саламея Русецкая – знакамітая лекарка і падарожніца XVIII ст.
37. Якуб Наркевіч-Ёдка – прафесар электраграфіі і магнетызму.
38. Уладзіслаў Дыбоўскі – рыцар навукі з Нянькава.
39. Станіслаў Нарбут – народны лекар з Браслава.
40. Ігнат Дамейка – сын Беларусі і народны герой Чылі.
41. Ян Чэрскі – славуты географ і падарожнік.
42. Аркадзь Смоліч і яго «Геаграфія Беларусі».
43. Аляксандр Кавалеўскі – славуты вучоны-біёлаг.
44. Аляксандр Чыжэўскі – Леанарда да Вінчы XX ст.
45. Чырвоная кніга Беларусі.
46. Белавежская пушча.
47. Бярэзінскі запаведнік.
48. Тапанімічныя назвы Беларусі.
49. Возера Нарач.
50. Тры назвы аднаго возера (Князь-возера, Жыцкае, Чырвонае).
51. Возера Свіцязь.
52. Геалагічныя помнікі прыроды Беларусі.
53. Кветкі – жывыя барометры.
54. Дрэвы-помнікі на Беларусі.
55. Грыбы Беларусі (іх назвы ў беларускай і рускай мовах).
56. Рыбы Беларусі (іх найменні ў беларускай і рускай мовах).
57. Птушкі Беларусі (іх найменні ў беларускай і рускай мовах).
58. Табліца Мендзялеева (назвы хімічных элементаў у беларускай і рускай мовах).
59. Караль Чаховіч – эксперыментатар з Беластоцкай гімназіі.
60. Жыгімонт Урублеўскі – уладар холаду.
61. Аляксандр Садоўскі – даследчык таямніцаў святла.
62. «Арыфметыка» Л. Ф. Магніцкага.
63. Казімір Семяновіч – вынаходнік шматступеневай ракеты.
64. Рымская і арабская сістэмы лічбаў.
65. Адлік часу. Гісторыя календара.
66. Як мы лічым. З гісторыі лікаў.
67. З гісторыі дробаў.
68. Геаметрычныя фігуры (іх назвы ў беларускай і рускай мовах).
69. Беларускія назвы метрычных адзінак.
70. Крыж Еўфрасінні Полацкай – выдатны помнік старажытнага мастацтва.
71. Яўстах Тышкевіч – руплівец нашай старасветчыны.
72. Адам Міцкевіч – славуты паэт, вялікі сын нашага народа.
73. Язэп Драздовіч у гісторыі беларускага мастацтва
74. Напалеон Орда і яго знакамітая серыя «Альбомы».
75. Музыка ў камені: Нясвіжскі замак.
76. Слуцкія паясы.
77. Музеі г. Мінска.
78. Міхал Клеафас Агінскі – аўтар паланеза «Развітанне з Радзімай».

79. Напалеон Орда і яго музычная спадчына.
80. Антоній Радзівіл – аўтар музыкі да оперы «Фауст».

Вучэбная, вучэбна-метадычная работа

У справаздачны перыяд увага членаў кафедры была сканцэнтравана:

– на ўдасканаленні распрацаваных лекцыйных курсаў (іх дапрацоўцы і дапаўненні ў адпаведнасці з новымі дасягненнямі айчыннай і замежнай гуманітарнай навукі);

– на распрацоўцы інавацыйных падыходаў у выкладанні вучэбных дысцыплін (падрыхтоўцы матэрыялаў для дыстанцыйнага навучання і т. зв. віртуальнага навучальнага асяроддзя);

– на метадычнай распрацоўцы індывідуальных падыходаў у курсе выкладання рускай мовы як замежнай, апрабацыі новых форм адаптацыйнай палітыкі для замежных студэнтаў;

– на распрацоўцы праграм канкрэтных мерапрыемстваў у адпаведнасці з планамі дзейнасці кафедральных гурткоў;

– на вывучэнні новай метадычнай літаратуры па курсах, выкладанне якіх забяспечваецца кафедрай.

Апрабацыя распрацаванага вучэбнага матэрыялу ажыццяўлялася:

– на лекцыях і практычных занятках;

– на субяседаваннях з патэнцыяльнымі студэнтамі БДТУ з ліку грамадзян Дэмакратычнай рэспублікі Конга, Казахстана, Лівана;

– падчас навуковага кіравання студэнцкімі рэфератамі, навуковымі конкурснымі працамі, творчымі студэнцкімі праектамі і даследаваннямі;

– падчас кансультацый замежных навучэнцаў II ступені вышэйшай адукацыі (магістраў) перад абаронай магістарскіх дысертацый;

– на занятках гурткоў;

– пры правядзенні алімпіяд па выкладаемых дысцыплінах у БДТУ, а таксама пры падрыхтоўцы навучэнцаў да ўдзелу ў алімпіядзе рэспубліканскага ўзроўню.

Навуковая работа

Навуковая работа кафедры была скіравана на рэалізацыю наступных асноўных кірункаў:

– праца над чарговым этапам навукова-даследчай тэмы кафедры ў адпаведнасці з вызначаным сегментам асабістага ўдзелу кожнага выкладчыка;

– падрыхтоўка выступленняў, дакладаў для наступнага ўдзелу ў навуковых канферэнцыях і навукова-практычных семінарах розных узроўняў;

– падрыхтоўка тэзісаў і артыкулаў у рэчышчы кафедральнай навукова-даследчай тэмы;

– кіраўніцтва навуковай працай студэнтаў;

– кансультацыі навучэнцаў (у тым ліку магістрантаў і аспірантаў) па пытаннях філалагічнага профілю;

– арганізацыя студэнцкіх навукова-практычных канферэнцый;

– вывучэнне навуковай літаратуры па актуальных пытаннях мовазнаўства, літаратуразнаўства, лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі;

– інтэрнэт-падтрымка навуковых ініцыятыў кафедры.

Асноўныя вынікі навуковай дзейнасці выкладчыкаў кафедры прадстаўлены ў рэферыруемых выданнях са спісу ВАК Рэспублікі Беларусь: «Труды БГТУ», «Весці БДПУ», «Вестник МГЛУ», «Беларуская лінгвістыка».

Даклады членаў кафедры прайшлі апрабацыю на шэрагу міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцый (даклады апублікаваны).

Ідэалагічная і выхаваўчая работа

Тэарэтычнай і практычнай базай ідэалагічнай і выхаваўчай працы выкладчыкаў кафедры былі наступныя кірункі:

– вывучэнне праграмных, рэгламентуючых дакументаў па актуальных пытаннях ідэалагічнай і выхаваўчай працы ў рэспубліцы;

– кансультацыйная падтрымка падрыхтоўкі студэнтаў у выхаваўчых мерапрыемствах БДТУ, іншых універсітэтаў, а таксама культурна-асветніцкіх устаноў Рэспублікі Беларусь;

– сінхранізацыя кафедры з актуальнымі ініцыятывамі выхаваўчага плану БДТУ, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь;

– арганізацыя экскурсій па музеях г. Мінска;

– арганізацыя культпаходаў у культурна-асветніцкія ўстановы г. Мінска;

– прафарыентацыйная работа ў сярэдніх агульнаадукацыйных установах, гімназіях г. Мінска і ўсёй Беларусі;

– падрыхтоўка артыкулаў, выступленняў у масмедыйнай прасторы з мэтай папулярызаваць кафедральны вопыт ідэалагічнай і выхаваўчай працы.